# Тыдзень беларускай мовы і літаратуры

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім.
Максім Танк

**З 17 па 22 лютага** ў школе праходзіў тыдзень беларускай мовы і літаратуры. Кожны дзень быў надзвычай багаты на мерапрыемствы. Настаўнікі-філолагі размеркавалі мерапрыемствы так, каб была задзейнічана максімальная колькасць вучняў у іх правядзенні.

Пачаў эстафету 10 “А” клас, у якім Бруева Т.А. праводзіла “Інтэлектуальны марафон” паміж трыма камандамі. Вучні паказалі свае веды па беларускай мове і літаратуры. Перамогу атрымала каманда “Фіз=мат” на чале з капітанам – Валынец Лізаветай.






У гэты ж дзень Крэпская Т.А. правяла для вучняў 8 “В” класа мерапрыемства “Чароўны квадрат”, на якім вучні выконвалі творчыя заданні, якія развіваюць кемлівасць і агульны кругагляд вучняў. Таксама Таццяна Анатольеўна падрыхтавала заданні для завочнай віктарыны “Гэта я ведаю” для вучняў 6 “Б” і “В” класаў, якія яны будуць выконваць на працягу ўсяго тыдня.

18 лютага вучням 6 “А” класа Бруева Т.А. прапанавала паўдзельнічаць у мерапрыемстве “Мой род. Мая сям’я. Мой народ”. Вучні з задавальненнем расказвалі пра сваіх продкаў, сямейныя традыцыі, падрыхтавалі шмат ілюстрацыйнага матэрыялу сваімі рукамі.











Таксама Таццяна Аляксееўна арганізавала выставу малюнкаў вучняў да твораў беларускай літаратуры, дзе можна было ўбачыць лепшыя ілюстрацыі вучняў 5-11 класаў.  А для вучняў 10 "Б" класа было праведзена мерапрыемтсва "Шчаслівы выпадак". У правядзенні мерапрыемства былі задзейнічаны вучні-алімпіяднікі Качан Вікторыя і Клімовіч Яраслава, якія прапанавалі свае заданні дзесяцікласнікам. Перамогу атрымала каманда "Валошкі" на чале з Герановічам Раманам.




Акрамя таго, Клімовіч Яраслава і Томкавіч Аляксей прынялі ўдзел у раённым конкурсе фотаздымкаў "Сэлфі з любімай кнігай" .




*(падрыхтавала матэрыялы для конкурсу Бруева Т.А.)*







19 лютага Крэпская Т.А. задзейнічала 11-класнікаў у правядзенні спаборніцтва “Разумнікі і разумнікі”. Выпускнікі прадэманстравалі свае веды па мове, якія спатрэбяцца ім пры здачы ЦТ. Найбольшую колькасць балаў атрымаў Смолка Андрэй.



20 лютага вучняў 8 “А” і “Б” класаў чакала гульня “Слабае звяно”, якую правяла Бруева Т.А. У індывідуальным заліку найлепшыя вынікі паказалі вучні 8 “А” класа: Томкавіч Аляксей, Лявіцкая Вераніка, Радзівонава Кацярына.




20 лютага вучні школы прынялі ўдзел у рэспубліканскім конкурсе "Буслік" 58 удзельнікаў сярод 5-11 класаў)..

20 лютага Церах А.В. падарожнічала з вучнямі 5 "А" і "Б" класаў па краіне Мовазнавіі. Атрымалася захапляльнае падарожжа-спаборніцтва паміж камандамі "Валошкі" і "Рамонкі".









21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы. У гэты дзень у школе прайшло асабліва шмат розных мерапрыемстваў. Акцыю "Адкрыты мікрафон" праводзіла Бруева Т.А. і Осіпаў К.М.  Вучні 3-11 класаў маглі на працягу дня падыходзіць да мікрафона і чытаць на памяць вершы беларускіх аўтараў. Жадаючых было вельмі шмат. Кожны мог праявіць свае акцёрскія здольнасці і прадэманстраваць навыкі выразнага чытання вершаў перад шырокай аўдыторыяй.

Таксама на працягу дня Яўціхава К.М. і Бруева Т.А. разам з вучнямі праводзілі акцыю “Размаўляй са мной па-беларуску”, у ходзе якой вучні і настаўнікі школы атрымлівалі закладкі-буклеты са словамі беларускіх аўтараў.











Кажура М.І. для вучняў 7 “В” класа правяла “Моўны турнір”, у ходзе якой вучні змаглі паказаць сваю кемлівасць, знаходлівасць і эрудыцыю.

Церах А.В. вучняў 7 “А”і “Б” класаў запрасіла прыняць удзел у гульні “Чароўны квадрат”, у ходзе якога вучні набылі шмат карыснай інфармацыі і новых уражанняў.







Бруева Т.А. правяла гульню паміж вучнямі 10 “А” і “Б” класаў “Шчаслівы выпадак”. Перамогу атрымала каманда 10 “А” класа (капітан Залеўскі Андрэй).

Таксама 21 лютага ў школе праводзілася акцыя “Маё любімае беларускае слова”, у ходзе якой кожны настаўнік і вучань мог запісаць на дошцы-планшэце слова, якое яму больш за ўсе “песціць слых”.

















У заключны дзень тыдня Томкавіч У.К. прапанаваў 9-класнікам прыняць удзел у пазакласным мерапрыемстве "Свая гульня. Беларускія слоўнікі". У ходзе мерапрыемства вучні даведаліся больш пра розныя віды слоўнікаў беларускай мовы, папоўнілі свае веды па арфаграфіі, фразеалогіі, лексіцы, а таксама ўзбагацілі свой слоўнікавы запас.

Дзякуй усім арганізатарам і ўдзельнікам прадметнага тыдня. Пераможцы атрымалі сувеніры, выдатныя адзнакі, а ўсе ўдзельнікі – добры настрой і новыя веды.